Н.М. Борсук, А.М. Бауэр
УА "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт"

## "Радыяцыя – нябачны акупант": знакава-сімвалічны характар твораў пра Чарнобыль

26 красавіка 1986 года – сумная дата для Беларусі і ўсяго чалавецтва. Як трапна заўважыў С.Законнікаў, менавіта пасля выбуху чацвёртага блоку Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі "адлік пачынаўся нязнанае эры" [5, с. 170]. Жыццё падзялілася нібыта на дзве эпохі: да і пасля Чарнобыля: "Пасля Чарнобыля жывём у іншым свеце, ранейшага свету няма"; "... Чарнобыль перамясціў нас з аднаго часу ў другі. Перад намі рэальнасць, новая для ўсіх..."[2, с.21].

Асноўны вобраз беларускай прозы – вобраз Зямлі, апеты Я.Коласам, І.Мележам, К.Чорным, І.Пташнікавым, І.Чыгрынавым, у літаратуры пра Чарнобыль не мае нічога агульнага з такімі паняццямі як дабрабыт, багацце, спадчына, аснова жыцця, душа селяніна-працаўніка.

У аповесці "Краем белага шляху" В.Карамазаў выказваецца пра зямлю ад імя сваіх герояў: "І не воўчая яна, а наша з табою, родненькая" [7, с.116]. Героям твора цяжка змірыцца з думкаю, што давядзецца пакінуць родны край, не жадаюць яны аддаваць сваю зямельку ваўкам на спажыву. Прыметнік воўчы па-іншаму пераасэнсоўваецца В.Быкавым у аповесці "Ваўчыная яма". Ваўчыная яма – зона адчужэння, знак бяды, сімвал маральнай дэградацыі. У гэтым пекле добраахвотна пасяліліся салдат-дэзерцір, бомж, наркаманка. Ім няведамы інстынкт самазахавання, уяўленне аб нармальным чалавечым існаванні. Але нават гэтыя людзі, на першы погляд, амаральныя тыпы, не могуць жыць у зоне, бо гэта тупік, выраджэнне. Невыпадкова бомж незадоўга да смерці раіць салдату ратавацца. Чарнобыль абудзіў чорныя інстынкты ў людзей, з'явіліся марадзёры, рабаўнікі. Журботны хаўтурны звон, які гучыць у быкаўскай аповесці над сканалым бамжом, нямоглым ваўком, ахопленым перадсмяротным жахам салдатам, набывае вялікую моц. Гэты звон нагадвае нам, беларусам, аб небяспецы, якая навісла над намі. Наступствы Чарнобыля маюць глабальны характар. Як сцвярджаюць вучоныя, ужо ў 2015 годзе колькасць насельніцтва ў Беларусі зменшыцца на цэлы мільён, дзве трэці сумарных чарнобыльскіх выкідаў па сваёй знішчальнай сіле эквівалентны ажно дзевяцістам атамным бомбам, як тая, што ў свой час адна зруйнавала Хірасіму.

Безумоўна, сэнс літаратуры пра Чарнобыль – узнавіць горкую і балючую праўду, якая доўгі час упарта замоўчвалася. Героі аповесці В.Быкава "Ваўчыная яма" падкрэсліваюць, што катастрофа была звязана з гонкай узбраення, бо ў Чарнобылі не толькі выпрацоўвалі неабходную людзям электраэнергію: "Прычына катастрофы – усё ж у абаронцы. Для ракет патрэбны ўзбагачаны плутоній. Во абароншчыкі і пагналі яго, каб выканаць і перавыканаць планы да свята ўсіх працоўных – Першага мая. Тэхніка не вытрымала. А за ёй і абаронка, ды й палітыка таксама. Але ж у гэтай дзяржаве палітыка – рэч неаспрэчная, у ёй ніхто ніколі не сумняваецца. Толькі чаму яна патрабуе столькі ахвяраў?" [3, с. 157].

Нікога не пакідае абыякавым сцэна сяўбы ў чарнобыльскай зоне ў аповесці В.Казько "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел", бо на гэтым свяце працы шчыруюць нябожчыкі. У рамане І.Шамякіна "Злая зорка" туман успрымаецца як сігнал-папярэджанне: "Я думаю пра ранішні туман... Ён дзёр табе горла" [10, с. 70]). Дым, які звычайна папярэджвае аб пажары, пісьменнік выкарыстоўвае, каб перадаць бездапаможнасць людзей перад небяспекаю:

– Хлопцы ўкраінскія прыплылі, расказвалі: на станцыі пажар быў. Усе кіеўскія пажарныя там. І міліцыя з усёй вобласці.

Словы ўдарылі Глебу ў сэрца. Чамусьці спалохалі. Ні на міг не сумняваўся, што размова ідзе аб іх станцыі, але чамусьці спытаў:

– На якой станцыі?

– На якой? На тваёй. Якая не дыміць" [10, с. 66].

Адбітак Чарнобыля можна заўважыць у знешнасці людзей. "Чарнобыльскім вожыкам" называе В.Казько Дарожкіна, героя аповесці "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел". У гэтым вызначэнні і спачуванне маладому чалавеку, і перасцярога самаўлюбёнаму кіраўніку, што бяда не абыходзіць сваёй увагай і прадстаўнікоў улады.

У адрозненні ад В.Казько трагедыю, што наступіла пасля выбуху ў Чарнобылі, І.Пташнікаў паказвае вачыма сабакі. Гэты арыгінальны падыход быў абраны пісьменнікам невыпадкова. Па-першае, з мэтаю нагадаць, што перад смерцю ўсе раўны. Па-другое, каб абвастрыць успрыняцце трагедыі, бо жывёла бездапаможная перад тэхнагеннымі наступствамі. І.Пташнікаў падрабязна апісвае благі стан сабакі Джукі. Праз успрыманне Джукі розных пахаў празаік перадае набліжэнне бяды: пах гару, бензіну, ёду, дэзінфекцыі, кіслай псіны. Кульмінацыя твора, на наш погляд, бачыцца ў эпізодзе, калі Джукі ўбачыў лысых сабак – гэта вынік наступстваў Чарнобыля: "І зноў Джукі разанула па вачах – усе яны аблезлі: і Брынза, і Малекула, і два Бімы... Хто знізу з жывата, хто зверху са спіны. Жоўтая Брынза была ўся голая..." [9, с. 277]. Сабакі ўбачылі, што Джукі не лысы, яны кінуліся на яго. Як бачна, трагедыя спараджае адмоўныя інстынкты: сабакі раней сябравалі, а цяпер ад ганьбы, адчаю, зайздрасці кідаюцца на такога ж, як яны. Знешнім выглядам сабакі нагадвалі львоў. Каб жывёлы не разносілі Чарнобыль, іх адстралялі. Чалавек адчувае перад Джукі віну за чарнобыльскую катастрофу, таму і вырашыў вадзіцель самазвалу выратаваць адзінага неаблезлага сабаку з зоны: "Гэта ж падумаць... Ён да мяне ў кабіну. Ратавацца. І правільна зрабіў: жысь твая на валаску вісела. Правільна, брат зрабіў... Жыві!" [9, с. 283]. У гэтым "спадзяванне аўтара на лепшую долю і ўпэўненасць у заўтрашнім дні Беларусі" [4, с. 47].

Матыў адчаю і папярэджання трагедыі пісьменнікі раскрываюць праз выкарыстанне эпітэтаў і параўнанняў ("жыватворнае балота" да Чарнобыля і пасля: "Балота ўсыхала, глынуўшы вады ў ракі Леты, душа яго забывала мінулае, таму што амярцвела, хаця і супраціўлялася смерці захаванымі ў запаветнай глыбіні і цішы правальнымі скрозь зямлю астраўкамі дрыгвы. Як жабы на купіну, з той балотнай дрыгвы паскакалі апошнія лесуны, чысцікі і нячысцікі, вадзенікі і шышыгі. Лёгкія на нагу д'яблы адхрышчваліся ад сябе і давалі дзёру са свайго балота, забыўшыся, што без балота няма і чорта, і вольна таму чорту блажыць у сваім балоце. І не было і няма, пэўна, нічога больш страшнага, як увераваны чорт" [6, с. 138]), назваў-сінонімаў (Чарнобыль – Хірасіма, "нуклідная зона"), антонімаў ("блаславёная зямля" – пустыня). Красамоўная назва вёскі Хатынічы ў творы Л.Левановіча "Палыновы вецер" сугучна з назваю Хатынь: "Глыбокая цішыня стаяла над Хатынічамі, засыпанымі смертаноснымі радыёнуклідамі. Зямля свяцілася імі, акурат мільёнамі светлякоў. Бліскучае зорнае неба паварочвалася, быццам кола на восі, вакол непарушнай Палярнай зоркі" [8, с. 21].

Як бачна, творы пра Чарнобыль – знакава-сімвалічныя. І гэта невыпадкова. Па перакананні С.Алексіевіч, Чарнобыль у пэўным сэнсе слова з'яўляецца "вяршыняй філасофіі абсурду" [1, с.189]. Філасофскае меркаванне пісьменніцы мае навуковае пацверджанне: толькі па цэзію-137 – гэта сотні Хірасім.

ЛІТАРАТУРА:


1. Алексіевіч, С. Радыёактыўны агонь: Чаму досьвед Чарнобылю ставіць пад сумнеў нашае бачаньне сьвету // Дзеяслоў. – 2003. – № 6.
2. Алексіевіч, С. Чарнобыльская малітва // Полымя. – 1998. – № 4.
3. Быкаў, В. Ваўчыная яма // Полымя. – 1999. – №1.
4. Дамброўская, С. Роля прыроды ў раскрыцці ідэйнага зместу апавядання Івана Пташнікава "Львы" // Роднае слова. – 2001. – №2.
5. Зорка палын: Творы беларускіх паэтаў пра чарнобыльскую трагедыю. – Мн. : Маст. літ., 2003.
6. Казько, В. Выратуй і памілуй нас, чорны бусел. – Мн. : Маст. літ., 1993.
7. Карамазаў, В. Краем Белага шляху // Аброчны крыж. – Мн. : Маст. літ., 1994.
8. Леванoвіч, Л. Палыновы вецер // Полымя. – 2005. – № 3.
9. Пташнікаў, І. Львы // Пташнікаў, І. Тартак. – Мн. : Маст. літ., 2000.
10. Шамякін, І. Злая зорка // І.Шамякін: зб. тв. – Мн. : Маст. літ., 2005.